55 ГАДОЎ «ЖАНІЦЬБЕ БАЛЬЗАМІНАВА» 5

ВЯСЁЛЫЯ ГІСТОРЫІ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 ЛЮТАГА 2019 г. ПЯТНІЦА № 36 (28903)

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Павел УЦЮПІН, міністр прамысловасці:

«Уступленне Беларусі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю не нясе вялікіх рызык для айчыннага прамысловага сектара. Для нас вялікіх выклікаў як такіх ужо не будзе. Сёння мы, па сутнасці, працуем па правілах СГА, усе рызыкі ўжо рэалізаваныя.

У прыватнасці, гаворка ідзе пра дамоўленасці і абавязацельствы Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Адпаведна, дэ-факта мы знаходзімся ў СГА, дэ-юрэ, вядома, ёсць пытанні. Аднак пераваг ад уступлення ў СГА значна больш, чым рызык, паколькі з'явіцца больш магчымасцяў юрыдычна абараніць інтарэсы беларускіх вытворцаў, калі іх прадукцыю не дапускаюць на замежныя рынкі. Мы разлічваем, што Беларусь далучыцца да арганізацыі ў 2020 годзе».

КАРАТКА

• У Беларусі правядуць шырокае анлайн-анкетаванне з мэтай вывучэння меркавання аб новых навучальных дапаможніках.

• З 21 лютага ў Беларусі змяняюцца рознічныя цэны на аўтамабільнае паліва. Кошт бензіну AI-92 складзе Br1,44, AI-95 — Br1,55, AI-98 — Br1,76, ДП — Br1,55.

• Дзяржаўтаінспекцыя заклікае кіроўцаў быць больш уважлівымі падчас туману і зменлівага надвор'я.

• Кавярні з робатамі-барыста беларускай вытворчасці адкрыюцца ў аэрапортах Мінска і Кіева.

• У Беларусі захворальнасць на ІППШ у 2018 годзе знізілася ў параўнанні з 2017-м на 4,6 % і склала 208,3 выпадку на 100 тыс. насельніцтва.

ISSN 1990 - 763X

«ПАНТЭРА» ДЛЯ БАЙКЕРА

Эксклюзіўныя арт-аб'екты мастака з Фаніпаля Уладзіміра КАНОНІКА можна ўбачыць на абласных аўтазапраўках «Беларуснафта». Напрыклад, у Слуцку ўсталяваны жалезны «пегас», сканструяваны з бэушных аўтазапчастак, у Заслаўі і ў Нясвіжы стаяць ваяры-рыцары ў адпаведных латах, у Фаніпалі, Барысаве і Мінску знайшлі месца іншыя інтэрактыўныя ўвасабленні майстра. Нарэшце, апошні арт-аб'ект — «матацыкл-пантэра» — пасяліўся на сталічнай запраўцы.

— Я імкнуўся ў вобразе «мотапантэры» паказаць прыгажосць, моц і хуткасць, якімі ў аднолькавай меры валодае і грацыёзная дзікая кошка, і двухколавы матацыкл, — кажа Уладзімір Канонік пра гэты арт-аб'ект. — У яго стварэнні мне дапамагалі іншыя спецыялісты — зваршчыкі, бляхары, кавалі.

Ужо дзесяць гадоў кніжны графік шукае адметную графіку ў метале, у незвычайных вобразах і дызайнерскіх канструкцыях. І таму яго «аўтазаправачныя фішкі» нікога не пакідаюць раўнадушнымі.

На гэтым здымку браты Арцём і Ягор ШАРОХІ з цікавасцю знаёмяцца з незвычайным «байкерам» Уладзімірам Канонікам.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Культпрастора

ТАНЕЦ З... ЛЫЖКАМІ,

або У гурце толькі хлопцы!

Калі вы лічыце народную музыку цікавай для вузкага кола слухачоў, значыць, вы ніколі не былі на канцэрце «Нясвіжскіх лыжкароў». Абсалютная большасць удзельнікаў гэтага народнага інструментальнага ансамбля — маладыя зухаватыя хлопцы, у чыіх выступленнях — і танцавальны імпэт, і гумарыстычна-пластычныя замалёўкі, і спалучэнне самых нечаканых музычных фрагментаў: ад «Касіў Ясь канюшыну» да Smoke on the water. Калектыў існуе ўжо больш як 12 гадоў, мае багаты рэпертуар і гастрольны вопыт, а сёлета атрымаў высокую ўзнагароду — спецыяльную прэмію Прэзідэнта за папулярызацыю музычнага мастацтва, мэтанакіраваную работу па эстэтычным выхаванні падрастаючага пакалення і актыўную канцэртную дзейнасць. Карэспандэнты «Звязды» напрасіліся ў госці да «Нясвіжскіх лыжкароў», каб праверыць, ці не сапсавала хлопцаў слава, і распытаць мастацкага кіраўніка калектыву Уладзіміра СУХАВЕЯ пра тое, чаму з лыжкамі толькі юнакі і як ансамбль шумавых інструментаў ператварыўся ў культурную адметнасць.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

СТАР. 4

Жыллёвае пытанне

Штучны ажыятаж на «квадраты»

Ці паўплываюць буйныя спартыўныя спаборніцтвы на кошт здымнага жылля ў Мінску

Рынак нерухомасці заўсёды нестабільны перад значнымі мерапрыемствамі, якія прыцягваюць турыстаў. Патэнцыйныя арандатары заўважаюць, што напярэдадні II Еўрапейскіх гульняў у Мінску ўжо падняліся кошты на здымнае жыллё.

Нам стала цікава, няўжо тыдзень пражывання ў сталіцы з 21 да 31 чэрвеня абыдзецца гасцям у разы даражэй, чым заўсёды? Будучыя турысты ўжо актыўна абмяркоўваюць пытанне жылля на форумах і ў сацсетках. Некаторыя падумваюць, што трэба арандаваць кватэру прасцейшую, але на месяц — маўляў, так дакладна танней, чым зняць апартаменты на тыдзень і аплачваць кожныя суткі.

Як адзначае **аналітык у сферы нерухомасці Арцём САХАРЭВІЧ**, пачатак года — гэта перыяд невялікага ажыўлення на рынку доўгатэрміновай арэнды жылля. Ужо не першы раз адзначаецца рост попыту ў гэты час. Можна выказаць здагадку, што з надыходам новага года людзі больш схільныя да змены абстаноўкі і пераезду ў новую кватэру.

У цяжкія для эканомікі гады, калі ў студзені трэсла курс долара, падобную актыўнасць можна было спісаць на нежаданне арандатараў і ўласнікаў ісці на ўступкі ў пытанні зніжак. Аднак лакальны студзеньскі ўсплёск з'яўляецца нормай і для спакойных гадоў.

Калі казаць аб пачатку гэтага сезона, то аказаць уплыў на рынак арэнды кватэр магло тое, што напярэдадні II Еўрапейскіх гульняў студэнтаў масава высялялі са Студэнцкай вёскі. І хоць, па запэўненнях прадстаўнікоў ВНУ, студэнтам прапаноўвалі іншыя інтэрнаты, некаторыя, асабліва старшакурснікі, маглі пераехаць на здымнае жыллё.

СТАР. 3

АДЗІНСТВА МОЦНЫХ

Прэзідэнт анансаваў нараду з сілавым блокам краіны

Яе тэмы — вынікі мінулага года і праблемныя пытанні, аб чым заявіў Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам генеральнага пракурора Беларусі Аляксандра Канюка.

Беларускі лідар адзначыў, што генеральнаму пракурору трэба далучыцца да кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта і Савета бяспекі для падрыхтоўкі нарады ўсяго сілавога блока па выніках мінулага года. «Пры гэтым я папрашу засяродзіцца не на дакладах аб нашых вялікіх дасягненнях — яны таксама ёсць, яны вядомыя, — а на тых пытаннях, над якімі нам трэба будзе працаваць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт зноў падкрэсліў: змест будучай нарады — вынікі працы і праблемы. «Каб мы іх абгаварылі і прымалі рашэнні калегіяльна».

А непасрэдна на ўчарашняй сустрэчы кіраўнік дзяржавы заклікаў генпракурора асвятліць тыя пытанні, якія былі адзначаны раней па асноўных напрамках работы пракуратуры, а таксама выказацца па тых аспектах, якія маюць патрэбу ў рэакцыі беларускага лідара.

Другое пытанне — спартыўнае: Аляксандр Канюк з'яўляецца старшынёй Беларускай федэрацыі лыжных гонак. Прэзідэнт пацікавіўся, як на чэмпіянаце свету паказваюць сябе беларускія спартсмены, на што яны могуць прэтэндаваць.

ПАКАЗАЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ

Па выніках сустрэчы генеральны пракурор Беларусі Аляксандр Канюк пагутарыў з журналістамі, расказаўшы аб выніках працы пракуратуры, а таксама аб крымінагеннай сітуацыі, якая склалася ў 2018 годзе. «Ёсць станоўчыя моманты, тэндэнцыі. Зменшылася колькасць цяжкіх злачынстваў», — паведаміў ён.

Агульная колькасць зарэгістраваных злачынстваў у параўнанні з 2017 годам скарацілася на 2,9 %. Разбояў стала менш на 22 %, забойстваў — на 10 %, крадзяжоў — на 8 %, грабяжоў — на 5 %.

Аляксандр Канюк нагадаў, што ў свой час быў прыняты закон, які ўвёў больш жорсткую адказнасць за кіраванне транспартным сродкам у стане ап'янення. «Памяншаецца колькасць такіх людзей, тым больш, як вы ведаеце, паўторнае кіраванне яшчэ азначае і канфіскацыю аўтамабіля — гэта мае ўздзеянне. У гэтых адносінах станоўчая тэндэнцыя (колькасць такога роду злачынстваў скарацілася на 14 %. — **«Зв.»**), — пацвердзіў генпракурор.

НОВЫ ФАРМАТ АНТЫКАРУПЦЫЙНЫХ КАМІСІЙ

Была звернута ўвага на асноўныя, дадзеныя раней, даручэнні Прэзідэнта — па знешняй дэбіторскай запазычанасці, а таксама па барацьбе з карупцыяй. У прыватнасці, у канцы мінулага года Аляксандр Канюк сумесна з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта і старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі аб'ехаў усю краіну, правёў спецыяльныя пасяджэнні ў выканкамах менавіта па пытаннях карупцыі.

Генеральны пракурор расказаў пра каардынацыйную нараду, якая была праведзена ў канцы мінулага года. Агульнае меркаванне ўсіх прысутных на гэтым мерапрыемстве — ёсць неабходнасць перафарматаваць работу гэтых камісій, надаць ім вялікую значнасць і статус, каб неабходныя рашэнні і працэсы не зацягваліся. На асабістую думку Аляксандра Канюка, трэба, каб гэтыя камісіі ўзначальвалі кіраўнікі прадпрыемстваў, выканаўчых камітэтаў розных узроўняў.

«Цяпер мы рыхтуем змены ў закон аб барацьбе з карупцыяй. Там будзе не толькі гэта, іншыя моманты яшчэ паправім, улічваючы, што ўжо ёсць напрацаваная практыка. Мы перагаварылі з людзьмі, з кіраўнікамі гэтых камісій. Ёсць вельмі добра працуючыя, талковыя кіраўнікі, яны нам нешта падказалі», — дадаў Аляксандр Канюк.

Дарэчы, за мінулы год у Беларусі істотна выраслa колькасць выяўленых карупцыйных злачынстваў — плюс 31 % да ўзроўню 2017 года.

МАХЛЯР ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАКАРАНЫ

Што датычыцца дэбіторскай запазычанасці, то яна сапраўды паменшылася, пацвердзіў журналістам генеральны пракурор. Ён звярнуў увагу, што даручэнне кіраўніка дзяржавы пракуратуры заняцца гэтым аспектам з'яўляецца досыць абгрунтаваным. «Існавалі крымінальныя схемы, — падкрэсліў Аляксандр Канюк. — Нам удалося прыпыніць працэс гэтых махлярскіх схем».

У якасці прыкладу падобнага злачынства ён прывёў пастаўкі айчыннай прадукцыі за мяжу, калі грошы за яе не вярталіся. «У нас ужо ёсць канкрэтныя крымінальныя справы. Кіраўнік аднаго з мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў асуджаны за тое, што была нанесена салідная шкода дзяржаве», — дадаў генеральны пракурор.

Яшчэ адно пытанне сустрэчы з Прэзідэнтам — лыжныя гонкі. Як старшыня Беларускай федэрацыі лыжных гонак, Аляксандр Канюк адзначыў, што на чэмпіянаце свету па гэтым відзе спорту выступае перафарматаваная каманда з новым галоўным трэнерам. «Спадзяёмся на нашых беларускіх спартсменаў, таму што, на жаль, вопыт легіянераў, або, як гэта прынята цяпер казаць, людзей з іншых краін, паказаў не вельмі добры вынік», — сказаў ён.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

СЛЕДЧЫЯ ДЗЕЯННІ

Аляксандр Лукашэнка прыняў са справаздачай старшыню Следчага камітэта Івана Наскевіча

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што вельмі ўважліва сочыць за работай Следчага камітэта. «Мы ў свой час пайшлі на вельмі рашучыя крокі, мадэрнізуючы, фактычна рэфармуючы нашы праваахоўныя органы. Следства выведзена з усіх ведамстваў і займае асобнае, лідзіруючае месца», — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы, што следства павінна быць незалежным, калі мы хочам пэўных і эфектыўных вынікаў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што разгледзеў зварот Івана Наскевіча наконт інстытута павышэння кваліфікацыі спецыялістаў. Перад тым як прыняць рашэнне, кіраўнік дзяржавы хоча пачуць альтэрнатыўнае меркаванне, калі яно ёсць.

Яшчэ адна тэма сустрэчы — расследаванне крымінальных спраў, якія знаходзяцца на кантролі ў Прэзідэнта. Гэта ў большасці забойствы, якія атрымалі грамадскі рэзананс, у прыватнасці забойства прадпрымальніка пад Беразіном. Расследаваннем гэтай справы Следчы камітэт займаецца сумесна з Міністэрствам унутраных спраў. Была створана група з вопытных следчых, праваахоўнікі адпрацоўвалі ўсе магчымыя версіі. Аднак да гэтага часу аб якіх-небудзь выніках не паведамлялася.

Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу, што апошнім часам у сувязі з судовымі справамі ўрачоў, злачынствамі, якія звязаны са школьным харчаваннем, у грамадстве пачаліся развагі пра тое, ці варта асуджаць такіх злачынцаў. «Усе перад законам роўныя, — упэўнены Прэзідэнт. — Але пры гэтым трэба мець на ўвазе адно: ні Гасподзь, ні людзі нам не даруюць, калі мы пакараем невінаватага. Калі мы не можам даказаць, лепш не чапаць гэтага чалавека. Калі ён нягоднік, ён усё роўна пападзецца».

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз акцэнтаваў увагу на тым, што невінаватага чалавека караць недапушчальна. «Лепш хай злачынства застанецца нераскрытым, чым мы яго раскрыем і павесім віну на невінаватага чалавека, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Калі мы цвёрда ўпэўненыя, што ён здзейсніў злачынства, мала не пакажацца. Асабліва чыноўнікам, чалавеку ў пагонах — гэта фактычна адно і тое, — то ім трэба памнажаць на два».

Адна з рэзананснych спраў, пра расследаванне якіх старшыня Следчага камітэта далажыў Прэзідэнту, — трагедыя ў Стоўбцах.

«Па гэтай справе праведзены ўжо вялікі аб'ём следчых дзеянняў. Карціна здарэння фактычна нам зразумелая. Для следчых на дадзены момант галоўная задача — высветліць не як гэта адбылося (гэта і так зразумела), а чаму гэта адбылося, — лічыць Іван Наскевіч. — У пэўнай ступені нейкія адказы ў нас ужо ёсць, зыходзячы з пакаранняў самога падазраванага. Пасля трох дзён маўчання ён-такі пачаў даваць паказанні. Пакуль мы вельмі крытычна ставімся да таго, што ён кажа, паколькі яго паказанні не заўсёды суадносяцца з аб'ектыўнай карцінай здарэння».

З дапамогай навуковатэхнічных сродкаў следчыя атрымалі доступ да мабільнага тэлефона і камп'ютара падазраванага. Інфармацыя з гэтых устройстваў перад злачынствам была знішчана.

«Мы зараз гэтай інфармацыяй валодаем. У інтарэсах следства я не стану раскрываць, што ў гэтым тэлефоне было. Але скажу, што ў пэўнай ступені гэта пралье святло на матывіроўку яго дзеянняў», — паведаміў у размове з журналістамі старшыня Следчага камітэта.

Падрабязнасці і новыя абставіны атрыманы па справе аб забойстве бізнесмена ў Беразіне. Па словах Івана Наскевіча, гэтая крымінальная справа стала не проста рэзананснай, а знакавай для краіны, таму што здзейснена відавочна, прылюдна, з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі, знішчэннем аўтамабіля.

«У нас ёсць сур'ёзныя зрухі па раскрыцці гэтага злачынства. І я думаю, што пасля правядзення невялікай колькасці аператыўных мерапрыемстваў і следчых дзеянняў для замацавання інфармацыі, якая ўжо ёсць, магчыма, сумесна з МУС мы грамадству заявім, што мы па гэтай крымінальнай справе ведаем, якія перадумовы здзяйснення злачынства, хто і як яго здзейсніў», — анансаваў кіраўнік Следчага камітэта і дадаў, што «падазраваны ўжо ёсць».

Па словах Івана Наскевіча, Прэзідэнт яшчэ раз адзначыў, што ведамства стваралася як фільтр, каб не прыцягваліся да адказнасці невінаватыя людзі.

«Я мяркую, што з гэтай задачай мы спраўляемся і справіліся, асабліва ў 2018 годзе. У якасці прыкладу прывяду лічбы: судамі ў мінулым годзе апраўданы 44 чалавекі з крымінальных спраў, расследаваных Следчым камітэтам. У той час як, напрыклад, у 2017-м такіх было 59 чалавек. Гэта не гаворыць пра тое, што суды сталі менш ліберальныя. Гэта сведчыць пра тое, што следчыя ў сваёй рабоце падпарадкоўваюцца толькі закону. Яны прынцыпова ставяцца да выпадкаў, дзе недастаткова доказаў, каб крымінальную справу ў адносінах да канкрэтнай асобы накіраваць у суд», — сказаў журналістам старшыня Следчага камітэта.

У мінулым годзе Следчы камітэт разгледзеў амаль 150 тысяч заяў і паведамленняў, каля 125 тысяч крымінальных спраў знаходзіліся ў вядзенні. Пры гэтым паказчыкі кожны год зніжаюцца, як і ўзровень злачынстваў у краіне.

Марыя ДАДАЛКА.

Парламенцкі дзённік

У В'ЕТНАМЕ ПАБУДУЕМ МАЛАКАЗАВОД

Аб стварэнні новага сумеснага прадпрыемства расказаў Уладзімір Андрэйчанка, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, на сустрэчы з паслом В'етнама ў нашай краіне Фамам Хаем. Бакі зацікаўлены ў нарошчванні паставак прадукцыі, стварэнні прадпрыемстваў і прыходзе інвестараў. Зараз разглядаецца і шэраг міжрэгіянальных пагадненняў.

Фота БелТА.

Беларускі бок чакае ў першай палове года візіту спадарыні Нгуен Тхі Кім Нган, старшыні Нацыянальнага сходу В'етнама. «Магчыма, падчас гэтага візіту мы падпішам дарожную карту аб супрацоўніцтве, дзе вызначым канкрэтныя мерапрыемствы па развіцці нашага міжпарламенцкага і не толькі ўзаемадзеяння. Можна ў рамках гэтага візіту правесці і бізнес-форум. Таму што аснова супрацоўніцтва — гэта перш за ўсё гандлёва-эканамічныя адносіны. Нягледзячы на тое што ў 2016 годзе было падпісана пагадненне аб зоне свабоднага гандлю паміж краінамі ЕАЭС і В'етнамам, на жаль, тавараабарот у нас не павялічыўся паміж Беларуссю і В'етнамам. І ён стабільна складае 120—130 мільёнаў долараў. Мы лічым, што адна з задач, у тым ліку парламентарыяў, усяляк садзейнічаць таму, каб нарошчваць узаемны тавараабарот», — падкрэсліў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Таксама ён нагадаў, што зараз заканчваецца стварэнне яшчэ аднаго сумеснага прадпрыемства «МАЗ-Азія». Завод знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці — каля 85 %. Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, неабходна прыкласці намаганні, каб прадпрыемства па зборцы грузавых аўтамабіляў запрацавала ў другой палове 2019 года. Акрамя таго, яшчэ ў 2017-м адной з транспартных карпарацый Ханоя былі перададзены на эксплуатацыю 32 нізкападлогавыя аўтобусы МАЗ, якія былі сабраныя ў Хашыміне. Яны паспяхова прайшлі абкатку, і ў канцы мінулага года з'явілася прапанова па арганізацыі зборкі гэтых аўтобусаў у Ханоі.

Фам Хай у адказ падкрэсліў: «Трэба павялічваць тавараабарот паміж нашымі краінамі. Пасля падпісання пагаднення з ЕАЭС нашы прадпрыемствы не скарысталіся ўсімі перавагамі. У найбліжэйшы час мы будзем больш працаваць з беларускімі партнёрамі».

Надзея АНІСОВІЧ.

УЛАДА ВЫХОДЗІЦЬ НА СУВЯЗЬ

У гэту суботу, 23 лютага, з 9.00 да 12.00 прадстаўнікі мясцовай улады правядуць чарговыя прамыя тэлефонныя лініі ў аблвыканкамах і Мінскім гарвыканкаме. На сувязь з насельніцтвам выйдуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч Альшэўскі. Тэл. 80162213121;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч Мацкевіч. Тэл. 80212222222;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна Зянкевіч. Тэл. 80232331237;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна Бубенчык. Тэл. 80152735644;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч Кунцэвіч. Тэл. 80222501869;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч Маркевіч. Тэл. 80175004160;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Арцём Мікалаевіч Цуран. Тэл. 80172224444.

Надвор'е

Падмарозіць яшчэ прыстойна, але ненадоўга

Так, у суботу месцамі чакаецца да мінус 15 градусаў, а ў панядзелак — ужо да 7 цяпла

У наступныя двое сутак асноўны ўплыў на надвор'е ў нашай краіне будзе аказваць халодны скандынаўскі антыцыклон, які прынясе сухое і калючае паветра, а тэмпературны фон панізіцца. Але пахаладанне будзе нядоўгім, ужо ў нядзелю на тэрыторыю краіны пачне паступаць больш цёплая паветраная маса атлантычнага паходжання, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння надвор'е ў краіне ў асноўным будзе вызначаць перыферыя халоднага скандынаўскага антыцыклону. На асобных участках дарог галалёдзіца. Удзень на большай частцы тэрыторыі чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра днём будзе 2—8 марозу. У суботу ўмовы надвор'я ў асноўным будзе вызначаць халодны антыцыклон. Прагназуецца пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па поўначы краіны пройдзе невялікі снег і мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 да мінус 13 градусаў, пры праясненнях — да 15 марозу. Удзень тэмпература будзе знаходзіцца ў межах ад 6 марозу па ўсходзе да 2 цяпла па захадзе краіны.

А вось у нядзелю атмасферны фронт прынясе ў многія раёны краіны кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да 6 марозу, па паўднёвым усходзе пры праясненнях панізіцца да мінус 9 градусаў, удзень будзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак умовы надвор'я будзе вызначаць няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з Балтыйскага мора. Месцамі па краіне пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах прагназуецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, удзень — ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, па захадзе краіны паветра прагрэецца да 7 цяпла. Хутчэй бы вясна...

Сяргей КУРКАЧ.

ВІЛЬНЮС ПРЫМАЕ БЕЛАРУСКІХ КНІЖНІКАЎ

У сталіцы Літвы — асветніцкае свята: учора пачаў сваю работу Вільнюскі кніжны кірмаш. Разам сабраліся выдаўцы з сямі краін свету. Сярод удзельнікаў — і беларускія кніжнікі.

Увазе наведвальнікаў, гасцей прэстыжнай выстаўкі — навінкі беларускага кнігавыдання за 2018 год, а таксама першыя кнігі, што пабачылі свет у сёлетніх студзені — лютым. Свае здабыткі прэзентуюць выдавецтвы «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», «Народная асвета», «Беларусь», «Беловагруп», Выдавецкі дом «Звязда», паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа і іншыя. Сярод навінак — і новае выданне легендарнай паэмы класіка польскай літаратуры Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» у перакладзе на беларускую мову з ілюстрацыямі народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча. На паліцах беларускага стэнда — шмат выданняў, якія прэзентуюць грамадскія ініцыятывы, галоўныя падзеі 2019 года. А гэта — буклеты, даведачная літаратура турыстычнага характару, усё тое, што расказвае пра знакамітыя мясціны Беларусі, прадстаўляе і спартыўныя аб'екты краіны ў пярэдадзень правядзення II Еўрапейскіх гульняў. Даволі шмат на выстаўцы краязнаўчай, гістарычнай літаратуры, якая расказвае пра розныя мясціны Беларусі.

А ў сувязі з тым, што ўвесь свет адзначае ў лютым Дзень роднай мовы, паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа прэзентаваў у Вільнюсе зусім нечаканае выданне — зборнік аднаго верша лаўрэата Нобелеўскай прэміі Рабіндраната Тагора «Мая залатая Бенгалія» на мовах свету». Гэтая кніга — яшчэ і напамін, што менавіта ў знак барацьбы гэтай далёкай ад Беларусі краіны за незалежнасць было ўсталявана свята 21 лютага — Дзень роднай мовы. Пад адной вокладкай сабраны тэксты на 50 мовах. «Мая залатая Бенгалія» гучыць са старонак кнігі, выдадзенай на англійскай, рускай, польскай, мангольскай, турэцкай, туркменскай, украінскай, урду, сербскай, чарнагорскай, македонскай і яшчэ дзясятках моў, як голас розных народаў, розных культур, розных памкненняў да шчаслівага жыцця. Увогуле міжнародны складнік, повязь Беларусі, беларускага мастацкага слова з іншымі моўнымі, культурнымі пластамі — адна з адметнасцяў стэнда з кнігамі Рэспублікі Беларусь. Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа прадстаўляе на выстаўцы яшчэ адзін праект — зборнік «Слова Купалы крочыць па свеце». У кнізе прадстаўлены невялікія нарысы, якія з'яўляюцца фактычна партрэтамі сяброў беларускай літаратуры ў розных краінах. Змешчаны і расповеды пра літоўскіх сяброў Беларусі — пісьменнікаў, публіцыстаў, перакладчыкаў Яронімаса Лаўцюса («У Беларусі я адпачываю душой і сэрцам»), Вітаўтаса Жэймантаса («Беларускімі сцежкамі Вільнюса»), якія, акрамя ўсяго іншага, з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Дарэчы, на беларускім стэндзе будзе прэзентавана і кніга вершаў літоўскага класіка Майроніса, выдадзеная па-беларуску. Укладальнік выдання, яго ініцыятар — Вітаўтас Жэймантас.

У праграме ўдзелу беларускіх выдаўцоў у кніжным кірмашы — і перадача бібліятэкі асветніцкай літаратуры Віленскай гімназіі імя Францыска Скарыны, а таксама перамовы з кіраўніцтвам Саюза пісьменнікаў Літвы.

Мікола БЕРЛЕЖ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Міністр эканомікі і энергетыкі ФРГ заявіў, што Германія не зацікаўлена ў санкцыях супраць Расіі

«Германія хацела б, каб умоў для захавання санкцыйнага ціску на Расію не было», — сказаў міністр эканомікі і энергетыкі ФРГ Петэр Альтмаер, выступаючы на канферэнцыі «Канкурэнтаздольная Расія — новыя шляхі», якая праходзіць у германскай сталіцы.

Міністр адзначыў, што санкцыі ўвялі, «паколькі для гэтага былі палітычныя перадумовы». І цяпер, паводле яго слоў, трэба працаваць над тым, каб палітычныя ўмовы памяняліся. «Мы хочам, каб украінска-расійская тэма была вырашана, каб «Мінск» быў рэалізаваны», — адзначыў Альтмаер, яшчэ раз падкрэсліўшы, што ў Берліна «няма зацікаўленасці ў санкцыях».

Страшны пажар у Бангладэш: загінулі больш за 80 чалавек

Восемдзесят адзін чалавек загінуў у выніку буйнога пажару ў сталіцы Бангладэш горадзе Дака. Як паведамляюць мясцовыя CMI, колькасць ахвяр можа павялічыцца: па меншай меры 50 чалавек шпіталізаваны, многія знаходзяцца ў цяжкім стане.

Мяркуецца, што пажар узнік у чатырохпавярховым жылым доме, на першым паверсе якога знаходзіцца хімічны склад. Затым агонь перакінуўся яшчэ на чатыры суседнія будынкі.

Мясцовыя жыхары паведамілі, што пажар адбыўся ў выніку выбуху газавага балона ў прыпаркаваным аўтамабілі. 37 пажарных падраздзяленняў змагаліся з агнём 10 гадзін. У тушэнні таксама былі задзейнічаныя верталёты. Прэм'ер-міністр краіны Шэйх Хасіна заявіла, што ўстрывожана тым, што здарылася, і выказала глыбокае спачуванне блізкім і сваякам загінулых.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Народнай Рэспублікі Бангладэш Абдулу Хаміду ў сувязі з гібеллю вялікай колькасці людзей у выніку моцнага пажару ў адным з жылых кварталаў у горадзе Дака, паведаміла прэс-служба беларускага лідара.

Forbes: у Расіі з'явілася другая жанчына-мільярдэр

Уладальніца інтэрнэт-крамы Wildberries Таццяна Бакальчук стала другой у Расіі жанчынай — доларавым мільярдэрам, па версіі Forbes. Кошт яе бізнесу, па падліках выдання, дасягнуў $1,2 млрд.

«Новая ацэнка кошту кампаніі дазваляе ацаніць багацце Бакальчук у больш чым $1 млрд. Яна становіцца другой жанчынай-мільярдэрам у Расіі пасля Алены Батурынай», — адзначаецца ў публікацыі.

Паколькі кампанія Wildberries не з'яўляецца публічнай, яе кошт ацэньваўся на падставе даных аб аб'ёме продажаў і прыбытку, а таксама па мультыплікатарах аналагічных праектаў і ацэнак венчурных капіталістаў, удакладнілі ў Forbes.

Інтэрнэт-крама Wildberries прадае розныя катэгорыі тавараў, у тым ліку цацкі, спартыўнае і дзіцячае харчаванне, электроніку, кнігі і г. д. У 2018 годзе выручка кампаніі склала $1,7 млрд. Таццяна Бакальчук з'яўляецца адзіным уладальнікам Wildberries.

Штучны ажыятаж на «квадраты»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Колькасць пошукавых запытаў тыпу «зняць кватэру ў Мінску» павялічылася за студзень амаль на 22 %. Што датычыцца прапановы кватэр, то колькасць аб'яў выросла за месяц на 7,8 %. Пры гэтым 10-працэнтны рост назіраўся ў катэгорыі «аднапакаёвыя кватэры», а аб'яў аб здачы двух- і трохпакаёвак стала больш на 6 %.

Дынаміка цэн на арэнду кватэр у студзені была станоўчай ва ўсіх сегментах. У залежнасці ад тыпу кватэр рост — ад 2 % да 4 %. Аднак у першым месяцы года скараціласа колькасць бюджэтных прапаноў. Гэта цалкам увязваецца з павышаным попытам на здымнае жыллё з боку студэнтаў, якія традыцыйна выбіраюць недарагія варыянты.

На пачатак лютага сярэднія цэны арэнды аднапакаёвых кватэр у горадзе склалі 250—260 долараў (рост за месяц склаў 2,5 %). Двухпакаёвыя кватэры ў сярэднім прапаноўваюць за 330—340 долараў (рост на 4,2 %), а трохпакаёвыя — за 400—420 долараў (рост на 3,6 %). За апошні год арэнда кватэр у сталіцы падаражэла на 8—11 % у залежнасці ад тыпу кватэр.

Прыкладна ў той жа час год таму можна было адчувальна танней арандаваць простую аднапакаёвую кватэру паблізу адной з крайніх станцый метро. Акуратная, цалкам мэбляваная кватэра, хай і без еўрапейскага рамонту, але з усёй патрэбнай тэхнікай, абышлася б тады ў 200 долараў за месяц.

Цяпер за 600 рублёў у Мінску прапануюць вельмі сціплыя варыянты, большасць з іх — без рамонту або без мэблі (а некаторыя — без таго і без другога). Ёсць, праўда, жыллё на апошніх паверхах старых дамоў. Напрыклад, у самым цэнтры горада за 15 хвілін ад метро на першым паверсе пяціпавярховіка здаюць аднапакаёвую кватэру за 270 долараў у месяц. Старыя драўляныя дзверы, пафарбаваная драўляная падлога і мэбля савецкіх часоў. Гаспадары згодныя нават на студэнтаў.

Па словах прадстаўнікоў сталічнага агенцтва нерухомасці, цэны на кватэры ў сталіцы і праўда крыху падраслі, але гаворкі аб вялікім скачку пакуль не ідзе. Попыт цяпер вышэйшы, чым у мінулым годзе. Але кардынальных змен пакуль няма.

Спецыялісты лічаць, што магчымасць значнага росту кошту арэнды кватэр у Мінску з-за будучых Еўрапейскіх гульняў невялікая, аднак не выключаюць, што бліжэй да лета сітуацыя на рынку можа змяніцца.

У многіх гасцініцах свабодных нумароў на даты правядзення Еўрапейскіх гульняў ужо няма альбо забраніраваны ўсе бюджэтныя месцы. Узрасла і арэнда апартаментаў.

Начальнік аддзела арэнды агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ лічыць, што цэны на арэнду кватэр у Мінску знаходзяцца прыкладна на тым жа ўзроўні, што і летам мінулага года. Уласнікаў, якія вырашылі павялічыць кошты, пакуль адзінкі.

Нагадаем, што да Еўрапейскіх гульняў Студэнцкая вёска стане турыстычным комплексам, на тэрыторыі якога, акрамя жылля, будуць кафэ, крамы, пральні, бібліятэкі і трэнажорныя залы. Таксама турысты змогуць своечасова атрымаць і медыцынскую дапамогу — тут размесцяцца стаматалагічны, працэдурны і тэрапеўтычны кабінеты.

Сяргей КУРКАЧ.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

Наблюдательным советом Открытого акционерного общества «МЕХКОЛОННА № 93» принято решение о проведении 28 марта 2019 года в 11.00 очередного годового общего собрания акционеров (протокол № 16 от 19.02.2019 года)

Место проведения собрания: 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 13, кабинет 303.

Форма проведения – очная.

№ п/п	ПОВЕСТКА ДНЯ
1	Об утверждении годового отчета Общества за 2018 год
2	Об утверждении годового отчета Наблюдательного Совета за 2018 год
3	Об утверждении годового отчета Ревизионной комиссии за 2018 год
4	О рассмотрении заключения ревизионной комиссии Общества за 2018 год, аудиторского заключения за 2018 год
5	Об утверждении годового бухгалтерского баланса за 2018 год и пояснительной записки к нему, отчета о прибылях и убытках Общества за 2018 год, отчета об изменении капитала Общества за 2018 год, отчета о движении денежных средств Общества за 2018 год
6	О покрытии убытков по итогам деятельности Общества за 2018 год и о планах распределения прибыли за 2019 год.
7	Об утверждении основных направлений деятельности Общества на 2019 год
8	Об избрании членов Наблюдательного совета Общества
9	Об определении размера и порядка выплаты вознаграждения членам Наблюдательного совета в связи с исполнением ими своих обязанностей
10	Об избрании членов ревизионной комиссии Общества
11	Об определении размера и порядка выплаты вознаграждения членам Ревизионной комиссии в связи с исполнением ими своих обязанностей

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 13 (каб. 214), в период с 21 марта 2019 г. по 27 марта 2019 г. по рабочим дням, с 10.00 до 16.00 либо 28 марта 2019 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 10.00 до 10.50 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 28 марта 2019 года, 11.00.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 23 марта 2019 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

– акционеру общества – паспорт;

– представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100003019

ТАНЕЦ З... ЛЫЖКАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

...У інтэрнаце Нясвіжскага дзяржаўнага каледжа імя Якуба Коласа нас ужо чакаюць. Хлопцы ў сцэнічных касцюмах і чорных шапках разбіраюць інструменты — хто лыжкі, хто гітару, а хто і пральную дошку. На падлозе расстаўляюць абавязковы рэквізіт — збаны, размаляваныя пад бярозу. Раней выкарыстоўвалі сапраўдныя цуркі, але тыя даволі цяжкія і займалі ў багажы нямала месца, у той час як пустацелыя збаны можна ўкладваць адзін у адзін.

— Гэты склад ансамбля, бадай, ужо шосты, — расказвае заснавальнік і кіраўнік «Нясвіжскіх лыжкароў» Уладзімір Сухавей. — Адных хлопцаў набіраем, пераважна з аддзялення фізічнай культуры, дзе іх больш за ўсё, а другія выпускаюцца.

— Не бывае крыху крыўдна: вы вучыце ўсё новых дзяцей, а яны выпускаюцца, сыходзяць, і практычна ніхто не працягвае гэты кірунак далей?

— У гэтым сапраўды ёсць пэўная складанасць, але, з іншага боку, і пэўнае хараство — мы не застойваемся на месцы, прыходзяць новыя людзі, новыя ідэі. І асабіста мне вельмі важна і прыемна тое, што сучасныя маладыя людзі праяўляюць цікавасць да народнай музыкі. Былі выпадкі, што нашы выпускнікі арганізоўвалі дзіцячыя калектывы, выступалі на розных конкурсах, таму пераемнасць, працяг музычных фальклорных традыцый усё ж ёсць.

Жыццё ў рытме

— На старых фотаздымках, напэўна, зробленых яшчэ падчас вучобы ў педагагічным універсітэце, бачыла вас з жаночым гуртам. То чаму ж у цяперашнім ансамблі ніводнай дзяўчыны, толькі хлопцы?

— Я, натхнёны творчымі камандзіроўкамі з нашым педагогам Уладзімірам Перацяцькам, доўга марыў сабраць свой эстрадны ансамбль, — але, бачыце, з цягам часу гэта ідэя трансфармавалася ў ансамбль шумавых інструментаў. ...Аднойчы кіраўніцтва прапанавала ўвесці ў склад дзяўчат. Узялі мы чатырох навучэнак з аддзялення фізічнай культуры, у іх была патрэбная выносліваcць, але не хапала пластыкі, грацыі, і ўжо на абласным конкурсе зразумелі, што ў такім складзе да рэспубліканскага этапу мы не дойдзем. Потым узялі танцорак, але гэта аказалася псіхалагічна складана: рана ці позна ў змяшаным калектыве завязваюцца рамантычныя стасункі, і ўсё, няма ніякай дысцыпліны, хлопцы не слухаюць кіраўніка, а слухаюць дзяўчат, сапернічаюць паміж сабой, што, зразумела, не ідзе на карысць агульнай працы. І з таго часу, хоць дзяўчаты пастаянна просяцца ўзяць іх у ансамбль, але я бачу, што з хлопцамі прасцей. Так што ў нас як на караблі.

— Важнае пытанне: адкуль лыжкі? Абы-якія ж не падыходзяць, правільна разумею?

— Цалкам так. Лыжак у калектыве прыкладна 56 штук, некалькі розных відаў: самыя вялікія ў рост чалавека, маленькія — як звычайныя сталовыя, але выраблены з нашмат больш трывалай драўніны, інакш «ляцяць» вельмі хутка. Майце на ўвазе: драўляныя лыжкі з сувенірнай крамы не вытрымаюць такой нагрузкі і не тое што год, другі, а і месяц не праслужаць. У нас нават адзін час была свая адмысловая «фішка»: калі на канцэрце лыжка ламаецца і драўляныя пырскі ляцяць у залу, у публікі шалёнае захапленне, таму нават назнарок ламалі. Але цяпер стараемся паберагчы, бо чалавека, які выразаў першы набор лыжак, ужо няма ў жывых, а майстроў у гэтай справе няшмат. Мы супрацоўнічалі з рознымі майстрамі. усё было не тое; цяпер лыжкі робіць наш выкладчык дызайну, народны ўмелец Алег Пракарына.

— Колькі часу трэба, каб новы ўдзельнік уліўся ў калектыў?

— Прыкладна паўгода — за гэты час ён вывучае рытмы, элементарную музычную грамату — што такое ноты, іх даўжыня, паўзы. Трэба натрэніравацца, бо гэта цяпер хлопцы могуць іграць і гадзіну, і дзве, а спачатку шмат сінякоў на каленях, на руках — часам да крыві... І толькі ў другім семестры можна выпускаць на сцэну. Хоць, натуральна, шмат залежыць і ад здольнасцяў самога падлетка — напрыклад, адзін хлопец праз тры дні засвоіў тое, на што іншым патрабуюцца месяцы. Але ў сярэднім за два-тры гады новы ўдзельнік бездакорна развучвае шэсць, сем твораў. А як знаходжу падыход да хлопцаў? Стараюся зацікавіць, але нікога не прымушаю. Бывае, дзіця адоранае, але псіхалагічна яму няўтульна ў калектыве, або бацькі супраць такой дадатковай нагрузкі — ну, калі не, дык не.

«Нясвіжскія лыжкары» шмат выступаюць — у Нясвіжы і Маладзечне, Мінску (днямі былі ў групе падтрымкі на «Гонцы легендаў»), у іншых гарадах Беларусі, а таксама ў Польшчы, Літве, Латвіі, Казахстане. «Летась былі на міжнародным фестывалі ў Ауцэ, латвійскім горадзе-пабраціме Нясвіжа, і калі ў вольны час іншыя ўдзельнікі ездзілі ў Рыгу на кірмаш, то мы — у Юрмалу, на мора, — расказвае кіраўнік. — Ведаеце, прыбалты, асабліва старэйшае пакаленне, на нашых выступленнях плачуць і гавораць, што адчуваюць вялікую настальгію. Неяк былі ў Польшчы пад Шчэцінам, у горадзе, абкружаным вялікім каналам, — і мы намотвалі па ім кругі на байдарках, з умовай: хто трапіў у ваду, сыходзіць з трасы, — такі адрэналін атрымалі! А самая памятная паездка, безумоўна, у Казахстан, паколькі там пазнаёміліся з зусім іншай, усходняй, культурай, і гэта неверагодна цікава».

Групавы партрэт

Адзіны з усіх удзельнікаў, хто скончыў каледж і застаўся ў калектыве, — **Павел ГОРБЕЛЬ** *(на фота)*. Зрэшты, цяпер ужо Павел Аляксеевіч, бо ён і сам выкладчык — працуе ў Нясвіжскім цэнтры дзіцячай творчасці, а ў «Лыжкарах» іграе на гітары. «Што мяне тут трымае? — перапытвае малады чалавек. — Ды няма ніякай таямніцы, проста вельмі падабаецца. У 2014 годзе я паступіў на першы курс каледжа на замежную мову — прычым дагэтуль з музыкай ніяк не быў звязаны, хоць на дзень нараджэння, якраз у канцы жніўня, купіў сабе гітару. Іграць яшчэ не ўмеў, але, калі Уладзімір Яўгенавіч спытаў у першакурснікаў, у каго ёсць інструменты, падняў руку. Мне далі балалайку, і адзін са старшакурснікаў паказаў, як яе правільна трымаць, каб іграць — балалайка была вельмі старая, лады счасаныя, і прыціскаць трэба было вельмі моцна, каб інструмент гучаў. Але я справіўся, і літаральна за 20 хвілін развучыў тры акорды, якія паказаў кіраўнік, прайшоў «баявое хрышчэнне» рэпетыцыяй. А ўжо праз тыдзень выступаў разам з ансамблем, мы сустракалі нейкіх важных гасцей у двары каледжа. І, ведаеце, спадабалася! Калі мы ўсе разам стаім на сцэне, гэта асаблівыя эмоцыі, якія цяжка перадаць словамі: і камандны дух, і адрэналін. Як ставяцца бацькі і сябры? Варта толькі пабываць на адным выступленні, як усім падабаецца, і ніводнага разу я не чуў меркавання, што «Нясвіжскія лыжкары» нямодныя або незапатрабаваныя».

Першакурснік **Дзіма ДРАНЧУК** у ансамблі ўсяго некалькі месяцаў і прызнаецца, што трапіць на сцэну Палаца Рэспублікі для яго было вялікім гонарам і стымулам развівацца далей: «Канешне, я разумею, што хлопцы, якія займаюцца некалькі гадоў, умеюць нашмат больш за мяне, але гэта не зайздрасць, хочацца за імі цягнуцца. І хоць я вучуся на «замежніка», але, магчыма, і наконт музычнай адукацыі падумаю».

А вось стараста аркестра **Улад СІНІЦЫН** сам гатовы вучыць музыцы іншых — напрыклад, сваіх будучых вучняў (ён па спецыяльнасці педагог малодшых класаў): «Я ж засвоіў не толькі лыжкі, а іграў на барабане, блокфлейце, бас-гітары, баяне — гэты інструмент якраз выкладае наш кіраўнік. Мне здаецца, калі паказаць вучням малодшых класаў наша выступленне і потым самім даць у рукі лыжкі, ім вельмі спадабаецца, таму зладзіць у школе дзіцячы ансамбль — чаму б і не?» А самому яму найбольш падабаюцца ў рэпертуары лыжкароў «Славянская» і «Юрачка» — выбухова-эмацыянальныя, дзе ансамбль найбольш абменьваецца энергетыкай з публікай.

Ансамбль — гэта не толькі выступоўцы на сцэне, але і тыя, хто знаходзіцца за кулісамі — выкладчыкі. Музыку знаходзіць і аранжыруе Уладзімір Сухавей, ідэю кожнага нумара прыдумляе ягоная жонка, а па сумяшчальніцтве загадчык музычнай кафедры каледжа Ганна Сухавей. Харэограф Кацярына Лабаза вучыць удзельнікаў правільна і прыгожа рухацца, дапамагае часам сарамлівым юнакам не проста зразумець, куды дзяваць рукі-ногі, а дазволіць целу жыць у танцы. За гімнастычную падрыхтоўку адказвае выкладчык фізічнай культуры Уладзімір Груша, дзякуючы якому і шпагат, і стойка на руках не з'яўляюцца для лыжкароў праблемай. Таксама каледж забяспечвае сваіх музыкаў сцэнічнымі ўборамі — адзін камплект эстрадны, другі — народны.

Каб душа разгарнулася

— Гэй, глядач, пускайся ў скокі, ці малец ты, ці стары — для цябе іграюць сёння «Нясвіжскія лыжкары»! — абвяшчае стараста, і ансамбль з месца ў кар'ер выдае некалькі заліхвацкіх мелодый, дэманструючы ўласныя магчымасці і разнастайнасць шумавых інструментаў. У футарале заўважаем сярод драўляных металічную лыжку:

— Хлопцы, хто халтурыць?

— Не, — смяюцца лыжкары, — гэта патрэбная рэч, бо ў нас жа яшчэ і пральная дошка, і тарка, і каса...

Была таксама бутэлечная батарэя, але ад яе адмовіліся — крохкая штука. А цяпер у лыжкароў, акрамя ўласна лыжак, баяна, балалаек, флейты і гітар, ёсць бубен, барабаны, канторскія лічыльнікі, трашчотка, і некалькі ўнікальных інструментаў — афрыканскі агаго, рытм якога пакладзены ў аснову карнавальнай самбы, і рэор, гучанне якога нагадвае шум крылаў узлятаючай птушкі. Кожны раз, бываючы ў Мінску, Уладзімір Сухавей зазірае ў музычную краму ў пошуках незвычайных цікавінак для ансамбля.

І ўсё гэта выкарыстоўваецца, бо «Нясвіжскія лыжкары» іграюць далёка не адны полькі і кадрылі — напрыклад, у некаторых папуры арганічна ўплецены акорды цяжкага року ад Black Sabbath, эстрадныя мелодыі. Ёсць у рэпертуары і «Гумарэска» Яўгена Глебава. Яе некалі «зняў» вопытны балалаечнік, зрабілі аранжыроўку і апрацоўку мелодыі: дадалі крыху джазавых элементаў і нават рок-н-рола, і атрымалася п'еса, хоць і складаная ў тэхнічным сэнсе, але надзвычай упадабаная і слухачамі, і самімі выканаўцамі. У планах — скласці «Беларускія найгрышы» з уключэннем іншых твораў Глебава. Расклалі для гармоніка і лыжак нават «Танец з шаблямі» Арама Хачатурана! Дарэчы, калі на II фестывалі краін ЕўрАзЭС у Астане кітайская дэлегацыя прафесійных музыкантаў пачула «Танец з шаблямі» ў версіі лыжкароў, апусцілася на калені, каб толькі зняць на відэа гэта выступленне.

Наогул, няўрымслівая натура і кіраўніка, і калектыву патрабуе эксперыментаў — таму ў народныя творы часта ўключаюць урыўкі з упадабаных эстрадных мелодый, класікі альбо рок-хітоў, калі толькі гэта не парушае агульную канцэпцыю нумара. Спачатку, прызнаецца Уладзімір Сухавей, кожную новую задумку ён выпрабоўвае на сабе — калі можа гэта сыграць і адчувае, што рытм падыходзіць для лыжак, значыць, ёсць сэнс працаваць далей.

У планах — зрабіць у электронным фармаце зборнік з рэпертуару «Лыжкароў», але пакуль «спісаць ноты» немагчыма — гэтыя напрацоўкі, а ўсе яны аўтарскія і ўнікальныя, педагог трымае ў сакрэце.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Больш фотаздымкаў, а таксама відэазапіс выступлення «Нясвіжскіх лыжкароў» глядзіце на нашым сайце www.zviazda.by.

УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 05.04.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Секуна П. В.

Легковой джип «BMW X6», АКПП, 2011 г. в., дизель, начальной стоимостью 46 900 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 02.04.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Цалко Д. А.

Легковой универсал «Форд Мондео», МКПП, 1999 г. в., дизель, начальной стоимостью 1 100 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

Отчет об использовании имущества местного культурного фонда «Страна Замков» за 2018 год

МКФ «Страна Замков» зарегистрирован в мае 2005 года. Основными целями и задачами фонда являются пропаганда и популяризация истории и культуры Беларуси. Учредитель фонда – Варикиш Александр Иосифович. Уставный фонд на 31 декабря 2018 г. составляет 5762 рубля. На 1 января 2019 года основные средства составили 12781,81 рубля. Общий объем выполненных работ – 105 000 рублей. Затраты для реализации программ – 101 000 рублей. Балансовая прибыль – 2 тысячи рублей.

УНП 690382807

Общество с ограниченной ответственностью «БЕЛТОРГКОМПАНИ» сообщает о проведении 12.03.2019 вторых повторных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества должника: станок форматно-раскроечный MJ1132B стоимостью 4 911,01 бел. руб., подробную информация можно узнать на сайте bankrot.gov.by.

УНП 190890870

ЗАО «ЦЕНТР ПРОМЫШЛЕННОЙ ОЦЕНКИ» ИНФОРМИРУЕТ

В извещение о проведении электронных торгов по продаже имущества ОАО «Автокомбинат № 6», опубликованном в газете «Звязда» от 20.02.2019, вносится изменение: **из лота № 2** исключается рация (инв. № П00000007). **Начальная цена лота № 2** без НДС составляет – 42 262,47, шаг аукциона – 2 113,12 бел. руб. **Из лота № 5** исключается шкаф для одежды (инв. № М00002381) и шкаф для документов (инв. № М00002382). **Начальная цена лота № 5** без НДС составляет – 22 206,67, шаг аукциона – 1 110,33 бел. руб.

УНП 100092856

Контактный телефон +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

Тэлесеткі

З ГРАШЫМА — НА ВЫХАД

Тэлеканал «Беларусь 1» абвясціў прыём заявак на ўдзел у новым забаўляльна-інтэлектуальным шоу «На вылет!».

У ім 50 папярэдне зарэгістраваных чалавек (наяўнасць або адсутнасць вышэйшай адукацыі і ўдзелу ў інтэлектуальных гульнях ролі не іграе, але неабходна, каб кожнаму з гульцоў было як мінімум 18 гадоў) паспрабуюць уласным розумам і інтуіцыяй здабыць галоўны прыз праекта — дзве тысячы беларускіх рублёў, а галоўны дырыжор гульні — праграмны дырэктар і радыёвядучы Unistar Аляксандр Найдзёнаў — зробіць усё, каб працэс атрымаўся няпросты і захапляльны.

«Гульня складаецца з пяці або шасці інтэлектуальных этапаў, у выніку якіх вызначыцца толькі адзін пераможца, які мае права ўзяць удзел у супергульні альбо адмовіцца ад яе, — расказалі «Звяздзе» ў медыяхолдынгу. — Барацьба ідзе па прынцыпе: хто няправільна адказвае — выбывае, ідзе на вылет». Запіс першага выпуску адбудзецца 13 сакавіка ў вялікай студыі Белтэлерадыёкампаніі, але запоўніць заяўкі патэнцыйным удзельнікам трэба загадзя — напрыклад, на сайце www.tvr.by альбо па тэлефоне (17) 389 65 22, што многія ўжо і зрабілі.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 63

Сваю сумесную задачу-мініяцюру (гл. дыяграму) прапануюць чытачам вядомы беларускі паэт Васіль Жуковіч (г. Мінск) і майстар спорту Мікалай Бельчыкаў (г. Барысаў).

Белыя: Крh5, Фf2, Сb4, Кс5, Кf3 (5).

Чорныя: Крf4, п.е4 (2).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

На традыцыйным «адкрытым» турніры ў Маскве найлепшы вынік з беларусаў паказаў Аляксей Фёдараў — 36-е месца пры 198 удзельніках. У Львове Арцём Сіняўскі фінішаваў другі.

* * *

У мінулых выпусках мы згадвалі паспяховую гульню беларускіх гросмайстраў на турнірах у Дэлі і Чэнаі (Індыя). Дзве наступныя партыі нашы суайчыннікі выгралі ў Дэлі.

Карэн Маўсісян — Кірыл Ступак. 1.Кf3 d5 2.g3 g6 3.Cg2 Cg7 4.0-0 e5 5.d3 Кс6 6.Кbd2 Кge7 7.e4 h6 8.ed К:d5 9.Кс4 0-0 10.Ле1 Ле8 11.Кfd2 Се6 12.c3 Фd7 13.Ке4 b6 14.a4 Лad8 15.a5 f5 16.Кed2 e4 17.d4 Cf7 18.ab ab 19.Фа4 Лb8 20.Ке3 b5 21.Фс2 К:e3 22.Л:e3 b4 23.Ле1 Ла8 24.Л:a8 Л:a8 25.Кf1 Ла2 26.Фb1 Ке7 27.f3 bc 28.bc Фс6 29.fe Ф:c3 30.Се3 С:d4 31.С:d4 Ф:d4+ 32.Крh1 Фf2 33.Ке3 fe 34.Фb8+ Крg7 35.Фb4 Кf5 36.Фс3+ Крh7, 0:1.

Аляксей Аляксандраў — Максім Лугаўскі. 1.d4 d5 2.c4 e6 3.Кс3 a6 4.cd ed 5.Cf4 c6 6.e3 Cd6 7.Кge2 Ке7 8.h4 Cg4 9.f3 Се6 10.h5 С:f4 11.К:f4 Кf5 12.Cd3 Фе7 13.Крf2 h6 14.Фb3 0-0 15.Лae1 Kd7 16.С:f5 С:f5 17.Ф:b7 Фd6 18.Фb3 Лab8 19.Фа3 Ф:a3 20.ba Кb6 21.g4 Ch7 22.Лe2 Кс4 23.Ка4 a5 24.Кс5 Лfe8 25.Лс1 Лb1 26.Лс3 Кb2 27.Лb3 Kd1+ 28.Крg3 Лс1 29.Лe1 a4 30.Лb6 f5 31.Kcd3 Ла1 32.Кf2 Л:a2 33.Л:d1 Л:a3 34.Л:c6 Ле:e3 35.Лd3 Ле:d3 36.К2:d3 fg 37.Лс8+ Крf7 38.Ке5+ Крe7 39.Лс7+ Крe8, 1:0.

* * *

У Маскве адбыліся два міжнародныя турніры па рашэнні шахматных кампазіцый: Кубак часопіса «Уральскі праблеміст» і Кубак Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэта. Міжнародны майстар з Беларусі Аляксандр Булаўка ў абодвух спаборніцтвах заняў шостыя месцы. Мінчанін Мікалай Сігневіч у Кубку «Уральскага праблеміста» быў сёмы. Цікава, што прызёры абодвух турніраў (расіяне Даніла Паўлаў, Анатоль Мукасееў, Даніла Маісееў, Яўген Віктараў, Аляксей Папоў) мінулай восенню паспяхова выступілі на XI Кубку «Альбіна» ў Мінску і ўвогуле пастаянна ўдзельнічаюць у гэтым штогадовым спаборніцтве ў беларускай сталіцы.

* * *

Прыморская федэрацыя шахмат (г. Уладзівасток) запрашае беларускіх аўтараў да ўдзелу ў міжнародным конкурсе складання шахматных задач, які прысвечаны памяці далёкаўсходняга шахматнага кампазітара Сяргея Бурмістрава (1960—1992). Конкурс праводзіцца ў раздзеле двухходовак, тэма вольная. Дапускаецца не больш за тры кампазіцыі ад аўтара, уключаючы калектыўныя творы. Суддзя — Анатоль Васіленка. Устаноўлены прызы, граноровыя і пахвальныя водгукі, спецыяльныя адзнакі. Першыя тры пераможцы ўзнагароджваюцца шахматнымі кнігамі. Задачы дасылаць да 1 жніўня 2019 года дырэктару турніра Яўгену Пермякову на электронны адрас permyakov63@mail.ru.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Се3. Першымі правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Дата

СІЛА Ў ПРАЎДЗЕ...

25 лютага споўнілася б 60 гадоў рэжысёру, сцэнарысту і прадзюсару Аляксею Балабанаву, які зняў культавыя стужкі «Брат» і «Брат 2» і падарыў пакаленню 90-х свайго, шмат у чым адмоўнага, але жывога героя.

Многія крытыкі заўважалі: Балабанаў рабіў кіно праўдзівым настолькі, што здавалася, такіх рэчаў і быць не можа. Так, адзін з найбольш супярэчлівых яго фільмаў «Груз 200» шмат хто не змог дагледзець да канца з-за жорсткіх сцэн, але ж яны былі заснаваныя на цалкам рэальных падзеях... Сам рэжысёр ніколі не дзяліў свае карціны на «добрыя» і «дрэнныя» і быў перакананы, што калі можна расказаць словамі, пра што фільм, то яго і здымаць не варта. Нярэдка, каб расказаць гісторыю так, каб глядач у яе сапраўды паверыў, Балабанаў запрашаў на здымачную пляцоўку непрафесійных акцёраў — і не прамахваўся. Яго фільмы заўжды запаміналіся адметнай музыкай, прычым рэжысёр сам загадзя выбіраў, што будзе гучаць за кадрам, а ўжо тады распрацоўваў далейшы сюжэт.

Меладрама «Мне не баліць», жорсткая «Вайна» і поўныя чорнага гумару ды малінавых пінжакоў «Жмуркі», напоўненыя сотнямі адценняў «Морфій» ці «Качагар», філасофскі гратэск «Пра вылюдкаў і людзей» і фантастычна-рэалістычны фільм (апошні фільм рэжысёра) «Я таксама хачу» — нам ёсць, за што быць удзячнымі Балабанаву і шанаваць яго памяць.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Сядзі і глядзі

«Анфіска, Раіска, сканчай сідроль!»

55 гадоў таму знялі камедыю «Жаніцьба Бальзамінава»

Летам 1964-га ў старажытным Суздалі рэжысёр Канстанцін Воінаў пачаў здымаць камедыю «Жаніцьба Бальзамінава», да якой сам жа напісаў сцэнарый паводле трылогіі Аляксандра Астроўскага «Святочны сон да абеду», «Свае сабакі грызуцца, чужы не прыставай» і ўласна «Жаніцьба Бальзамінава» («За чым пойдзеш, тое і знойдзеш»). І хоць практычна адначасова з ім у гэтых жа лакацыях здымаліся яшчэ два фільмы — «Андрэй Рублёў» Андрэя Таркоўскага і экранізацыя пушкінскай аповесці «Стрэл», — але дагэтуль мноства турыстаў едзе ў Суздаль менавіта ў пошуках «дома Бальзамінава».

